5. *Рамановіч, Н.* Як мы «пабудавалі» Школу фалькларыстаў : прафесійныя нататкі пасля семінара-практыкума / Наталля Рамановіч // Культура. – 2020. – 14 сак. (№ 11). – С. 12.

6. *Рамановіч, Н.* У пошуках свайго стылю / Наталля Рамановіч // Культура. – 2020. – 25 ліп. (№ 30). – С. 11.

7. *Ушкевіч, М.* Фарны, Каложа і палац у Свяцку... з гліны : у пасёлку Сапоцкін [Гродзенскага раёна] з'явіўся музей, дзе сабраны макеты вядомых архітэктурных помнікаў «бязвізавага рэгіёна» / Маргарыта Ушкевіч // Звязда. – 2019. – 6 лют. – С. 11.

УДК 069:39(476.2)

**В. Т. Сайфутдзінава,**
*старшы навуковы супрацоўнік дзяржаўнай установы культуры «Мазырскі аб'яднаны краязнаўчы музей», г. Мазыр, Рэспубліка Беларусь*

# МУЗЕЙ НАРОДНАЙ КУЛЬТУРЫ МАЗЫРШЧЫНЫ «ПАЛЕСКАЯ ВЕДА» ЯК ЦЭНТР ЭТНАКУЛЬТУРНАГА ДАСЛЕДАВАННЯ РЭГІЁНА І ПАПУЛЯРЫЗАЦЫІ НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

**Анатацыя.** *У артыкуле прааналізаваны вопыт Музея народнай культуры Мазыршчыны «Палеская веда» па даследаванні традыцыйнай культуры рэгіёна: абрадаў і звычаяў, народнай міфалогіі, традыцыйных ведаў, мясцовых рамёстваў і промыслаў, і рабоце па папулярызацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны.*

**Ключавыя словы:** *народная культура, народная міфалогія, этнакультурныя традыцыі, міфалагічнае светаўспрыманне, народныя веды, звычаі, абрады і рытуалы, музей народнай культуры, інтэрактыўныя практыкі, папулярызацыя нематэрыяльнай культурнай спадчыны.*

**V. Saifutdzinava,**
*Senior Researcher of the State Institution of Culture "Mozyr United Museum of Local Lore", Mazyr, Republic of Belarus*

# MUSEUM OF FOLK CULTURE OF MAZYR REGION "PALESKAYA VEDA" AS A CENTER FOR ETHNOCULTURAL RESEARCH OF THE REGION AND POPULARIZATION OF INTANGIBLE CULTURAL HERITAGE

**Abstract.** *The article analyzes the experience of the museum of folk culture of the Mazyr region "Paleskaya veda" in researching the traditional*

*culture of the region: rites and customs, folk mythology, traditional knowledge, local crafts and crafts, and work on popularizing intangible cultural heritage.*

**Key words:** *folk culture, folk mythology, ethnocultural traditions, mythological worldview, folk knowledge, customs, rites and rituals, museum of folk culture, interactive practices, promotion of intangible cultural heritage.*

Мазырскае Палессе – унікальны рэгіён з самабытнай культурай. Ужо з XIX ст. Мазыршчына з'яўляецца аб'ектам навуковага інтарэсу як айчынных, так і замежных даследчыкаў. Тут захаваліся інфармацыя і рэшткі традыцыйных звычаяў, абрадаў, рытуалаў, рамёстваў і промыслаў. Існуе значная колькасць навуковых публікацый, дзе даследуецца як матэрыяльная, так і нематэрыяльная культура Усходняга Палесся, Мазыршчыны ў прыватнасці [1–3; 7; 8; 14; 16].

Нягледзячы на тое, што народная культура становіцца менш аўтэнтычнай, праходзіць трасфармацыйны шлях, у апошні час назіраецца тэндэнцыя павышэння інтарэсу да яе сярод насельніцтва. Шляхі адраджэння і ўвядзення ў сучасны соцыум матэрыяльнай і нематэрыяльнай культурнай спадчыны шукаюць як навукоўцы, так і шматлікія групы аматараў.

Вялікі патэнцыял у гэтым маюць мясцовыя музеі. Краязнаўчы музей – месца, дзе сабрана інфармацыя аб рэгіёне. Мазырскі аб'яднаны краязнаўчы музей – гэта музей рэгіянальнай ідэнтычнасці. Ён створаны і дзейнічае як цэнтр рэгіянальных даследаванняў, рэалізоўваючы комплексную праграму па асвойванні мясцовага культурнага асяроддзя.

Музей народнай культуры Мазыршчыны «Палеская веда» створаны ў 1999 г. як культурны і навукова-даследчы цэнтр рэгіёна. Ён увайшоў у склад Мазырскага аб'яднанага краязнаўчага музея на правах філіяла. Пад назвай «веда» мелася на ўвазе сістэма астралагічных, міфалагічных, фальклорных, жыццёвых ведаў пра сусвет і існаванне чалавека ў ім, характэрная для такога ўнікальнага і абасобленага абшару чалавечай культуры, якім з'яўляецца Палессе (па аналогіі са старажытнаарыйскай VEDA). Мадэль свету, сатканая творчым розумам палешукоў, мае гарызантальнае і вертыкальнае чляненне, у аснове якога ляжыць кола – сімвал вечнага кругазвароту прыроды і вось-прадрэва, якое адпавядала трох'яруснай структуры свету і вызначала месца чалавека ў космасе [13].

Пры распрацоўцы навуковай канцэпцыі музея, стваральнікі абапіраліся на працы П. Шпілеўскага [15], Ю. Крашэўскага [5], М. Нікольскага [4], І. Сербава [9]. Найцікавейшы матэрыял па традыцыйнай культуры Мазырскага павета ў 1930-х гг. сабраў Казімір Машынскі [6]. Мэтанакіраванае даследаванне цэнтральнага рэгіёна Палесся (басейн Прыпяці) на пачатку XX ст. правёў А. Сержпутоўскі, які з 1884 г. па

1893 г. працаваў настаўнікам у школах Мазырскага і Слуцкага паветаў, а пазней – у этнаграфічным аддзеле Рускага музея ў Пецярбурзе. Яго працы маюць асаблівае значэнне, паколькі напрамую звязаны з тэмай музея «Палеская веда». У сваіх працах А. Сержпутоўскі падрабязна апісвае жыллё, сельскагаспадарчыя пабудовы, заняткі палешукоў (бортніцтва, земляробства, рыбалоўства, паляванне і інш.), а таксама іх звычаі, абрады і вераванні [10–12]. І гэты матэрыял сабраны на Мазыршчыне. Мазыршчына – вялікая этнічная тэрыторыя, якая ахоплівае некалькі сучасных адміністрацыйных раёнаў. П. Шпілеўскі разглядаў Мазыршчыну, уключаючы ў яе прасторавы кантэкст Тураўшчыну і Давід-Гарадок [15, с. 268].

Музей «Палеская веда» знаёміць з касмалагічнымі ўяўленнямі і спецыфікай міфалагічнага засваення рэчаіснасці, звычаямі і абрадамі цэнтральнай часткі ўсходнепалескага рэгіёна.

Экспазіцыя музея знаёміць наведвальніка з міфалагічным светаўспрыманнем і жыццёвым цыклам палешука ад нараджэння да смерці, з абрадамі і вераваннямі, якія суправаджаюць кожны этап жыцця чалавека на тэрыторыі Мазырскага Палесся.

У музеі адлюстравана сямейна-бытавая абраднасць (народзіны, вяселле, пахаванне), побытовая культура, традыцыйныя жаночыя і мужчынскія рамёствы і промыслы (ткацтва і апрацоўка лёну, земляробства, бандарства, паляванне, рыбная лоўля і інш.).

Даволі падрабязна паказаны старажытны промысел бортніцтва, якому нададзены статус нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва. Матэрыял для экспазіцыі быў сабраны ў в. Булаўкі Мазырскага раёна ў 1999 г., а таксама ў Петрыкаўскім і Жыткавіцкім раёнах у пачатку XXI ст. У экспазіцыі прадстаўлена борць другой паловы XIX ст., лезьво – прылада, з дапамогай якой лазілі на дрэвы, сітак – маска бортніка, сапетка – ёмістасць, у якую прыманьвалі пчол, зубель і дымары – прылады для абкурвання пчол, а таксама фотаздымкі бортнікаў першай паловы XX ст. Бортніцтва ў яго аўтэнтычным выглядзе захавалася ў вёсках Буда Казіміраўская, Гостаў, Махнавічы Мазырскага раёна. У в. Махнавічы бортнік Шаставец Аляксандр Лук’янавіч 1933 г. н. выкарыстоўваў і захаваў усе традыцыйныя бортныя прылады і веды, перададзеныя яму ад старэйшага пакалення бортнікаў.

Адным з найважнейшых і самых распаўсюджаных промыслаў на Мазыршчыне была і застаецца рыбная лоўля. Музей знаёміць з рыбалоўнымі прыладамі і традыцыйнымі спосабамі лоўлі рыбы, якія са старажытнасці існавалі на Палессі. Таптуха, восці, венцер, каробачкі для лоўлі ўюноў – такія прылады можна і ў сучасны час сустрэць у старых людзей, якія жывуць уздоўж Прыпяці. Маецца ў экспазіцыі і палескі човен першай паловы XX ст., які быў знойдзены Чарнобыльскай экспедыцыяй у Нараўлянскім раёне ў канцы 1990-х гг. Традыцыі вырабу прыпяцкага чоўна нададзены статус нематэрыяльнай гісторыка-

культурнай каштоўнасці. Наведвальнікі падчас экскурсіі знаёмяцца з тэхналогіяй вытворчасці і тыпамі чаўноў, якія былі характэрны для Мазыршчыны.

Экспазіцыя музея знаёміць і са святамі народнага календара, такімі як Русалка, Купалле. Русальная традыцыя больш характэрна менавіта для Усходняга Палесся, беларуска-руска-ўкраінскага памежжа [8, с. 12–13]. Русальная нядзеля апісана А. Сержпутоўскім у зборніку «Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў» [10, с. 203], феномен русалкі даследаваны У. Сівіцкім [8], Т. Кухаронак у 2000-х гг. [16, с. 336]. Абрад «Провады русалкі» (в. Вялікі Бор Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці) унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь і знаёмства наведвальнікаў музея з гэтым абрадам праходзіць менавіта на прыкладзе «Русалкі» з дадзенай вёскі.

Тэма вяселля адлюстравана на аснове калекцыі музея і экспедыцыйных даследаванняў. У экспазіцыі паказаны жаночы вясельны ўбор канца XIX – пачатку XX ст., вясельны вянок пачатку XX ст., галаўныя ўборы ручніковага тыпу – наміткі канца XIX – пачатку XX ст., ручнікі, посцілкі, адзенне і абутак канца XIX – сярэдзіны XX ст. Дэманструюцца і ўнікальныя рэчы – сэрпанкі (наміткі, выкананыя з тонкага ільнянога палатна) другой паловы XIX ст., знойдзеныя ў Жыткавіцкім раёне. Выканана рэканструкцыя палескага караваю, якая зроблена на падставе экспедыцыйных даследаванняў музея. У традыцыйным палескім караваі з цеста рабілася дрэва (сімвалічнае Дрэва Жыцця), сам каравай упрыгожваўся кветачкамі з цеста, шышачкамі, птушачкамі, папяровымі кветкамі рознага колеру. Пад дно каравая перад выпяканнем клалі цэлыя курыныя яйкі і выпякалі разам з яйкамі. Лічылася, што вельмі добра, калі пры дзяльбе каравая каму-небудзь даставаўся кавалак з яйкам (вёскі Барыскавічы, Лучажэвічы, Загорыны, Зімовая Буда Мазырскага раёна).

Пахавальны комплекс знаёміць з традыцыяй галашэнняў, памінанняў, вераванняў і ўяўленняў палешукоў аб смерці і пераходзе «на той свет». Палеская пахавальная абраднасць прыводзіць нас да высновы, што ў светаўяўленні нашых продкаў – смерць не абсалютны канец, а нейкі этап пераходу ў іншы свет і вяртання на зямлю ўжо ў другой якасці. Гэта значыць, што ў глабальным сэнсе жыццёвы шлях бясконцы [14, с. 108–114].

Музей абсталяваны інтэрактыўнымі зонамі, што дазваляе «агучваць» экспазіцыйныя комплексы з выкарыстаннем фальклорнай музыкі і дэманстраваць відэафільмы, якія знаёмяць з традыцыйнымі абрадамі і рамёствамі (провады русалкі, бортніцтва, рыбалоўства).

У вестыбюлі музея размешчана інтэрактыўная экспазіцыя (інфакіёск), дзе наведвальнікі могуць пазнаёміцца з фота- і відэаматэрыяламі, які назапашаны ў музейным архіве.

Трэба адзначыць, што шмат найцікавейшых ведаў і традыцыйных практык не ўвайшлі ў асноўную экспазіцыю, а па некаторых не хапала наяўнага матэрыялу. У пачатку працы музея «Палеская веда» востра адчуваўся недахоп інфармацыі па нематэрыяльнай спадчыне Палесся. Узнікла неабходнасць стварэння навукова-этналагічнага архіва. Таксама патрэбна было зафіксіраваць і задакументаваць праявы калектыўнай памяці рэгіёна.

У працэсе міждысцыплінарнага супрацоўніцтва Мазырскага аб'яднанага краязнаўчага музея, Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў быў распрацаваны праект цэласнага этнакультурнага даследавання Мазыршчыны, які атрымаў назву «Шляхамі А. К. Сержпутоўскага». Праект узнік у рамках праграмы развіцця музея як рэгіянальнага цэнтра культуры. Ён прадугледжвае шэраг сумесных экспедыцый Мазырскага аб'яднанага краязнаўчага музея і навуковых установ краіны па Мазыршчыне і Усходняму Палессю. Мэта экспедыцый – вывучэнне матэрыяльнай культуры Палесся і нематэрыяльнай культурнай спадчыны: збор помнікаў этнаграфіі, фіксацыя і дакументацыя мясцовых абрадаў і звычаяў, традыцыйных ведаў, рамёстваў і промыслаў, работа з носьбітамі мясцовых культурных традыцый. Яшчэ напачатку рэалізацыі праекта супрацоўнікі музея адчулі, што немагчыма абмежавацца толькі рамкамі Мазырскага раёна, патрэбна інфармацыя больш шырокая і грунтоўная для вывучэння і параўнання лакальных традыцый і складання банка даных.

Работа па праекце «Шляхамі А. К. Сержпутоўскага» пачалася ў 2002 г. і працягваецца па сённяшні час.

Акрамя таго, што падчас экспедыцый збіраюцца прадметы – помнікі этнаграфіі, даследаванні накіраваны на вывучэнне традыцыйнай нематэрыяльнай культуры: свят, абрадаў і рытуалаў, традыцыйных вераванняў, народнай міфалогіі. Экспедыцыі праходзілі ў Мазырскім, Петрыкаўскім, Жыткавіцкім і Лельчыцкім раёнах. Першыя тры экспедыцыі прайшлі сумесна з навуковымі ўстановамі, далейшыя даследаванні здзяйсняліся супрацоўнікамі Мазырскага музея самастойна.

Значная частка абрадаў амаль ужо страчана, на гэта ёсць розныя прычыны: адміранне вёсак, ад'езд моладзі ў горад, сыход з жыцця старых людзей – носьбітаў абрадаў, але дзякуючы даследаванням музейшчыкаў, фіксацыі і захаванню матэрыялу, ёсць магчымасць некаторыя абрады аднавіць. Напрыклад, даволі падрабязна запісаны калядны, вясельны абрады, рытуальныя дзеянні ахоўнага характару, традыцыі пакланенне крыніцам, абракання і аброчнага ткацтва.

Падчас паездак выявілі, што ў вёсках Мазырскага раёна да сярэдзіны XX ст. быў пашыраны рытуал аброчнага ткацтва, калі ў крытычных абставінах (эпідэмія, засуха, праліўныя дажджы) за вельмі кароткі час (за дзень альбо за ноч) ткаўся ручнік. Найбольш часта такі рытуал

выконвалі ў часы Вялікай Айчыннай вайны, каб хутчэй вайна скончылася, і родныя вярнуліся дадому. У в. Барыскавічы Мазырскага раёна «за адзін дзень посновалі, навілі, выткалі (ручнік)…». У гэтым працэсе ўдзельнічалі толькі замужнія жанчыны. Называўся ручнік «наметка», быў «вельмі тоненькі». Потым яго ахвяравалі ў царкву. Такія ручнікі ў в. Антонаўка ткалі яшчэ да сярэдзіны 80-х гг. ХХ ст. Ткаўся ён «ад дажджу» (Козыр Яўгенія Міхайлаўна 1922 г. н., Ермакавец Ганна Мікіцічна 1934 г. н., Траян Лідзія Мікалаеўна 1935 г. н., в. Барыскавічы).

Традыцыя абракання на крыжы захоўваецца амаль ва ўсіх вёсках Мазырскага раёна. Падчас экспедыцый падрабязна запісалі, пры якіх абставінах і як ставяцца крыжы, чаму і калі людзі абракаюцца.

*«За поворотом е крест. Хто обрекается, ходзім, помолімся. Я хожу. Завтра та субота кленовая, надо трапку повесіць, цветочкі, полотенце. Обязательно надо прыбраць креста к празніку. І жэншчыны обрекаются, і мужчыны…»* (Рэут Ганна Міхайлаўна 1933 г. н., в. Зімовая Буда).

*«…На кресты вешают, і я вешаю. Вот, напрімер, мое дзіця захворело. Вот обрекается человек. Вот на тэй і на тэй день повешу оброк, штоб оно поправілось. ... І абразік врезаны в крест. Дорожнікі делалі дорогу – отставілі, а сделалі – зноў паставілі на место. Это называется оброк. Обрекаютца, што пастаўлю там креста, штоб Бог помог, і поправілося мое дзіця…»* (Крупа Надзея Лявонаўна 1925 г. н., в. Крушнікі).

Да апошняй чвэрці ХХ ст. на Мазыршчыне актыўна святкавалі Каляды. У 2011–2013 гг. супрацоўнікі музея даведаліся ад жыхароў вёсак Іванкаўшчына, Надаткі, Лешня, Крушнікі, Матрункі Мазырскага раёна як святкавалі Каляды ў гэтай мясцовасці. Зафіксавалі, як называлі гэты перыяд, якія стравы гатавалі, што казалі, калі садзіліся за стол, як сустракалі калядоўшчыкаў і як паводзілі сябе тыя, хто калядаваў ці шчадраваў. Запісаны песні са «звяздой» і з «казой». Музею перадалі калядную маску казы і звязду, якія выкананы ў канцы 1990-х гг. у в. Надаткі.

*«…Перыяд з 6 па 19 студзеня называлі “Святыя дні”. Ложаць сено трошкі, ужэ на сено ставіцца каша под вечар, ставяць кашу на тое сено і ложаць на кашу пірага, бо каша далжна быць з пірагом ілі хлебам. І вот начынаюць кашу есць, здзіралі тыя прыгаркі і клалі ў круг (абруч з бочкі). Дак ужэ трэба даць курам, штоб оні поелі эці прыгаркі і не хадзілі па хатах»* (Вегера Дар’я Паўлаўна 1937 г. н., в. Іванкаўшчына).

*«У дом не заходзілі, а во двор, к окну, крычалі: “Добры вечар, шчэдры вечар! Позвольце песеньку попець!” Як казалі “пейце” – ужо паём. А то бывае, што у каго-та хто-та памер, дак нельзя, то кажуць:*

*”Мы вячэраем...»* (Турчын Вольга Герасімаўна 1932 г. н., в. Іванкаўшчына).

*«Яшчэ раней “звязду” рабілі, штоб свецілася. “Звязду” робяць: сярэдзіну, потым рогі: пяць-сем. З чыстай бумагі: склейвалі, красілі краскою. Яна прасвечвала. У сярэдзіну ставілі баночку, зярна насыпалі. Свечку ставілі, палілі. Еслі у кого Божая Маці – то ставілі у “звязду”. “Звязду” круцілі, яна круціцца, а свечачка ўсярэдзіне – не, на такой дошчачцы стаіць. І спявалі “Звязду”. Іх (са “звяздой”) па 12 чалавек хадзіла. Яны хадзілі атдзельна. Толькі мужчыны (хлопцы). “Звяздзе” багато плацілі – па 10 рублей. До дня белого “звязда” хадзіла...»* (Суханіцкая Марыя Фядотаўна 1937 г. н., в. Іванкаўшчына).

*«Нідзе так красіво не спявалі, как у Мялешкавічах. То й прыходзілі з Мялешкавіч...»* (Шэцка Таццяна Андрэеўна 1937 г. н., в. Іванкаўшчына). *«...Перад Крашчэнієм кашу ставяць на сено. На Крашчэніе снімаюць гаршка, убіраюць тое сено. Абводзілі хату мелом (следом за сонцам), а на дзверах коня рісовалі, што Каляда уехала. Ставілі кресцікі. А калі ішлі па воду, на калодец кресцік із соломы рабілі...»* (Турчын Вольга Герасімаўна, в. Іванкаўшчына).

У традыцыйным выглядзе калядны абрад ўжо не святкуецца, калядаванне спрасцілася: часцей за ўсё пераапранутыя дзеці ходзяць па хатах і кватэрах у шматпавярховых дамах з мэтай атрымаць грошы альбо цукеркі. Часам, на каляды на вуліцы можна сустрэць групы моладзі, якая апранута ў касцюмы хутчэй ў жанры фэнтэзі, чым у традыцыйныя. Але калядны абрад амаль ва ўсёй яго прыгажосці і шматграннасці можна аднавіць па этнаграфічных даследаваннях. Да таго часу, пакуль жывыя носьбіты ведаў, нельга лічыць, што традыцыя страчана, таму што яна захоўваецца ў памяці людзей і можа быць адноўлена.

Рэалізацыя праекта «Шляхамі А. К. Сержпутоўскага» вядзе да пашырэння выставачнай дзейнасці музея і актывізацыі папулярызацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Напрыклад, першая экспедыцыя прайшла ў 2002 г. у Лельчыцкім раёне, па выніках якой у музеі «Палеская веда» была арганізавана «Палессе на мяжы стагоддзяў». На адкрыццё былі запрошаны жыхары той мясцовасці, дзе праводзіліся даследаванні. Падчас адкрыцця выстаўкі выступіў фальклорны калектыў в. Дуброва Лельчыцкага раёна. Яны спявалі старажытныя песні ў сваёй традыцыйнай песеннай манеры сярод прадметаў, якія былі сабраныя ў в. Дуброва і суседніх вёсках. Гэтая з’ява шырока асвятлялася ў мясцовых сродках масавай інфармацыі. Наступныя выстаўкі называліся «Свет сялянскага дома» (пасля экспедыцыі ў Петрыкаўскім раёне), «Вялікі карагод» (даследаванні ў Жыткавіцкім раёне).

Сёння ў музеі «Палеская веда» працуе выстаўка традыцыйнага касцюма ўсходнепалескага рэгіёна «Вобразы мінулых пакаленняў», на

якой экспануюцца камплекты аддзення канца XIX – сярэдзіны XX ст. з фондаў Мазырскага аб'яднанага краязнаўчага музея, сабраныя ў Мазырскім, Петрыкаўскім, Жыткавіцкім, Лельчыцкім, Слуцкім раёнах. Значная частка адзення паступіла ў музей, дзякуючы рэалізацыі праекта «Шляхамі А. К. Сержпутоўскага». Падчас выстаўкі праводзяцца экскурсіі, лекцыі, музейныя заняткі, прысвечаныя гісторыі развіцця традыцыйнага касцюма ўсходнепалескага рэгіёна, семантыцы элементаў адзення, лакальным асаблівасцям строяў, абрадам і рытуалам, звязаным з адзеннем. Напрыклад, фартух, таксама як і намітка, быў своеасаблівым маркерам жанчыны. Без фартуха нельга ставіць хлеб у печ, хадзіць у царкву, да калодзежа па ваду. Калі жанчына была двойчы замужам, у труну ёй клалі два фартухі (в. Хільчыцы, Жыткавіцкі раён).

Пры арганізацыі музейных мерапрыемстваў на інтэрактыўнай панэлі дэманструецца вялікая колькасць фотаздымкаў і відэазапісаў, зробленых падчас экспедыцый.

У музеі «Палеская веда» арганізавана студыя-майстэрня, дзе майстры народных мастацкіх рамёстваў, якія працуюць у музеі, праводзяць заняткі і майстар-класы па саломапляценні, ткацтве, рабоце з глінай. Мастацкія практыкі саломапляцення Гомельскай вобласці ўнесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

Неаднаразова ў музеі праводзіліся выстаўкі вырабаў майстроў Мазырскага цэнтра нацыянальных культур і рамёстваў, якія акрамя выстаў арганізоўваюць майстар-класы па саломапляценні, ткацтве, пляценні паясоў.

Адной з форм работы музея па папулярызацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны з'яўляюцца тэатралізаваныя мерапрыемствы для дзяцей, прысвечаныя святам народнага календара, напрыклад «Прыйшлі Калядкі», «На Саракі пайшоў снег да ракі». Шмат заняткаў прысвечана побытавай культуры, рамёствам і промыслам Палесся, народнаму мастацтву.

Вялікую ролю ў вывучэнні і папулярызацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны іграе ўдзел супрацоўнікаў музея ў летніках і майстар-класах па вывучэнні традыцыйнай культуры.

Падобныя мерапрыемствы выклікаюць інтарэс у моладзі да нематэрыяльнай культурнай спадчыны, доказам таму з'яўляюцца шматлікія звароты ў музей за дапамогай і кансультацыямі ў асабістых даследаваннях па вывучэнні традыцыйнай культуры, гісторыі і традыцый сваёй сям'і, рамёстваў, народнага мастацтва.

Такім чынам, у той час, калі шмат народных традыцый трансфармуецца, мяняецца, знікае, рэгіянальны музей становіцца тым цэнтрам, які з'яўляецца даследчыкам, зберагальнікам і захавальнікам традыцыйнай культуры, выхавальнікам этнічнай самасвядомасці ў грамадстве.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


*1.* Беларусь праз прызму рэгіянальнай гісторыі: Прыпяцкае Палессе / Ю. М. Бохан [і інш.] ; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2016. – 441 с.

*2. Валодзіна, Т. В.* «Ядраное жыта гаспадар кліча»: каляндарны год у абрадах і звычаях / Т. В. Валодзіна, Т. І. Кухаронак. – Мінск : Беларус. навука, 2015. – 352 с.

*3. Кухаронак, Т.* Радзіны і маленства ў традыцыйнай культуры беларусаў / Т. Кухаронак. – Мінск : Беларус. навука, 2017. – 136 с.

*4. Нікольскі, М. М.* Жывёлы ў звычаях, абрадах і вераваннях беларускага сялянства / М. М. Нікольскі. – Мінск : Беларус. акад. навук, 1933. – 136 с.

*5. Kraszewski, I.* Wspomnienia z Poissia, Wolynia I Litvy / I. Kraszewski. – Wilno : Nakład I druk T. Glücksberga, 1840. – 2 т.

*6. Машынскі, Казімір.* Усходняе Палессе / Казімір Машынскі. – Мінск : Беларус. навука, 2014. – 526 с.

*7.* Общественный, семейный быт и духовная культура населения Полесья / В. К. Бондарчик [и др.], редкол.: В. К. Бондарчик [и др.]. – Минск : Наука и техника, 1987. – 374 с.

*8. Сівіцкі, У. М.* Русальная традыцыя беларусаў: міфапаэтычная сістэма, тыпалагічныя паралелі / У. М. Сівіцкі. – Мінск : Тэхналогія, 2006. – 187 с.

*9. Сербов, І. А.* Поездки по Полесью летом 1912 года / І. А. Сербов. – Вильна, 1914. – С. 70–102.

*10. Сержпутоўскі, А. К.* Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А. К. Сержпутоўскі. – Мінск : Выш. шк., 2009. – 478 с.

*11. Сержпутоўскі, А. К.* Палешукі-беларусы / А. К. Сержпутоўскі. – Мінск : Беларус. навука, 2018. – 172 с.

*12. Сержпутовский, А. К.* Земледельческие орудия белорусского Полесья / А. К. Сержпутовский // Материалы по этнографии России. – СПб. : Тов-во Р. Голике и А. Вильборг, 1910. – Т. 1. – С. 1–15.

*13. Сташкевіч, А. Б.* Некаторыя аспекты тэарэтычнай мадэлі музея народнай культуры Мазыршчыны «Палеская веда» / А. Б. Сташкевіч // Чалавек. Культура. Экалогія : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Гомель / Беларускі інстытут праблем культуры. – Мінск, 1998. – 125–127.

*14. Сысоў, У. М.* Беларуская пахавальная абраднасць: Структура абраду, галашэнні, функцыі слова і дзеяння / У. М. Сысоў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1995. – 182 с.

*15. Шпилевский, П. М.* Фольклорное наследие белорусов. Обряды. Поверья / П. М. Шпилевский. – Минск : Беларусь, 2020. – 342 с.

*16.* Этнокультурные процессы Восточного Полесья в прошлом и настоящем / А. Вл. Гурко [и др.]. – Минск : Беларус. навука, 2010. – 466 с.